# ЗАНЯТКІ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРАЙ ПА МЕСЦЫ ЖЫХАРСТВА Ў НОВЫХ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ УМОВАХ

*М. М. ФІЛІПАЎ,*
*намеснік дырэктара Навукова-даследчага інстытута фізічнай культуры і спорту Рэспублікі Беларусь, кандыдат педагагічных навук*

Рэформы, якія закранулі ўсю сучасную сістэму адукацыі, не абышлі і фізічнае выхаванне. Сучасны перыяд развіцця школы Рэспублікі Беларусь характарызуецца пошукам новых падыходаў да вызначэння зместу адукацыі. Намечаная рэформа (увядзенне 12-гадовай адукацыі) патрабуе перагляду і сістэмы фізічнага выхавання школьнікаў.

Новы падыход да фарміравання фізічнай культуры патрабуе кардынальных змяненняў у распрацоўцы агульнай педагагічнай тэхналогіі выкарыстання арганізацыйных форм, метадаў і сродкаў, рэалізуемых у працэсе заняткаў, у тым ліку і па месцы жыхарства.

Сучасныя сацыяльна-эканамічныя і экалагічныя ўмовы жыцця і быту школьнікаў адмоўна адбіваюцца на стане іх здароўя і фізічным развіцці.

Мэтай дадзенага даследавання з'явілася вывучэнне патрэбнасцей і інтарэсаў школьнікаў да заняткаў фізічнай культурай па месцы жыхарства. Анкетнае апытанне праводзілася ў школах Мінска, Магілёва, Гомеля, Віцебска, Гродна, Брэста, Барысава, Бабруйска, Мазыра, Оршы, Ліды, Баранавічаў, Смалявічаў, Стаўбцоў, Касцюковічаў, Хойнікаў, Полацка, Шчучына, Лунінца. У анкетаванні прынялі ўдзел 2419 школьнікаў старэйшых класаў. Выбарка характарызуецца паказчыкам па полу: юнакоў — 1011 (41,8 %), дзяўчат — 1408 (58,2 %).

Табліца 1

**Ацэнка неабходнасці заняткаў фізічнай культурай і спортам (% ад ліку апытаных)**

| Віды адказаў | Бал адказу па шкале | Усяго (n = 2419) | Юнакі (n = 1011) | Дзяўчаты (n = 1408) |
|---|---|---|---|---|
| Зусім няма неабходнасці | —5 | 0,6 | 0,6 | 0,6 |
| | —4 | 0,1 | — | 0,1 |
| | —3 | 0,2 | 0,2 | 0,2 |
| | -2 | 0,5 | 0,5 | 0,5 |
| | —1 | 0,5 | 0,5 | 0,6 |
| Абыякава | 0 | 5,7 | 4,7 | 6,5 |
| | +1 | 5,0 | 4,1 | 5,7 |
| | +2 | 7,9 | 8,4 | 7,6 |
| | +3 | 17,7 | 17,2 | 18,0 |
| | +4 | 23,2 | 26,3 | 20,9 |
| Вельмі неабходна | +5 | 38,6 | 37,5 | 39,3 |

Табліца 2

**Адносіны вучняў старэйшых класаў да заняткаў фізічнай культурай (% ад ліку апытаных)**

| Віды адказаў | Усяго (n = 2419) | Юнакі (n = 1011) | Дзяўчаты (n = 1408) |
|---|---|---|---|
| Заняткі цалкам задавальняюць | 48,7 | 52,0 | 46,3 |
| Хутчэй задавальняюць | 22,9 | 23,5 | 22,4 |
| Абыякава | 7,2 | 6,9 | 7,4 |
| Хутчэй не задавальняюць | 7,1 | 6,1 | 7,7 |
| Зусім не задавальняюць | 10,3 | 8,2 | 11,8 |
| Не магу адказаць | 5,8 | 3,3 | 4,4 |

З мэтай арганізацыі работы са школьнікамі старэйшых класаў па месцы жыхарства ў анкеце было прапанавана пытанне: «Уявіце, што ў вас з'явілася магчымасць заняцца фізічнай культурай па месцы жыхарства ў кваліфікаванага педагога-метадыста на бліжэйшай спартыўнай базе. Што б вы зрабілі?». Адказы размеркаваліся наступным чынам (гл. табл. 3).

Табліца 3

**Характарыстыка вербальных адносін да заняткаў фізічнай культурай па месцы жыхарства (% ад ліку апытаных)**

| Віды адказаў | Бал адказу | Усяго (n = 2419) | Юнакі (n = 1011) | Дзяўчаты (n = 1408) |
|---|---|---|---|---|
| Абавязкова заняўся б (станоўчы ўзровень інтарэсу) | + 1 | 43,5 | 48,4 | 40,0 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Не упэўнены, ёсць яшчэ справы, але заняўся б (сярэдні станоўчы | + 0,5 | 32,1 | 30,9 | 33,0 |
| Не заняўся б, нават калі б і было шмат вольнага часу (адмоўны) | — 1 | 4,7 | 4,5 | 4,9 |
| Цяжка адказаць (індэферэнтны) | 0 | 19,7 | 16,2 | 22,1 |

Аналіз атрыманых даных паказвае высокі працэнт школьнікаў старэйшых класаў, якія жадаюць дадаткова займацца фізічнай культурай — 43,5 % апытаных (32,1 % хістаюцца, але таксама заняліся б пры стварэнні ўмоў для заняткаў, і толькі 4,7 % юнакоў і дзяўчат выявілі абсалютна негатыўныя адносіны да дадатковых заняткаў фізічнай культурай). Трэба адзначыць, што значная частка школьнікаў (19,7 %) не мае канкрэтнага меркавання па дадзенаму пытанню.

Безумоўную цікавасць уяўляюць вынікі апытання школьнікаў у рэалізацыі іх вербальных адносін да заняткаў фізічнай культурай пры стварэнні спрыяльных умоў па месцы жыхарства (гл. табл. 4).

**Табліца 4**

**Патрэбнасці ў арыентацыі школьнікаў да заняткаў фізічнай культурай і спортам па месцы жыхарства (% ад ліку апытаных)**

| Віды адказаў | Усяго (n = 2419) | Юнакі (n = 1011) | Дзяўчаты (n = 1408) |
|---|---|---|---|
| Упэўнены | 49,5 | 63,1 | 39,8 |
| Хутчэй упэўнены | 27,7 | 21,2 | 32,5 |
| Цяжка адказаць | 18,0 | 12,7 | 21,8 |
| Хутчэй не ўпэўнены | 2,0 | 0,9 | 2,8 |
| Не ўпэўнены | 2,8 | 2,1 | 3,1 |

Неабходна падкрэсліць, што пацвярджэннем папярэдняга вываду з'яўляюцца даныя аб тым, што ў выпадку стварэння школьнікам спрыяльных умоў па месцы жыхарства іх арыентацыя ў занятках фізічнай культурай наступная: 63,1 % юнакоў і 39,8 % дзяўчат упэўнены ў тым, што заняліся б фізічнай культурай; 21,2 % юнакоў і 32,5 % дзяўчат хутчэй упэўнены, чым не; 12,7 % юнакоў і 21,8 % дзяўчат не могуць адказаць, і толькі 3,0 % юнакоў і 5,9 % дзяўчат не жадаюць займацца фізічнай культурай нават пры стварэнні спрыяльных умоў па месцы жыхарства.

Асаблівую цікавасць уяўляюць прычыны, якія падахвоцілі школьнікаў да заняткаў фізічнай культурай. Так, 41,9 % апытаных адказалі, што заняткі фізічнай культурай і спортам ім неабходны для паляпшэння фігуры, 40,1 % выказалі жаданне умацаваць здароўе, 27,5 % — палепшыць фізічнае развіццё, 18,7 % — палепшыць настрой, атрымаць задавальненне ад заняткаў, 18,2 % — дасягнуць больш высокіх спартыўных вынікаў. Па парадзе выкладчыкаў і прыкладу сяброў хацелі б займацца толькі 0,3 % і 1,7 % апытаных адпаведна (гл. табл. 5).

**Табліца 5**

**Прычыны, якія падахвоцілі школьнікаў да заняткаў фізічнай культурай і спортам (% ад ліку апытаных)***

| Прычыны | Усяго (n = 2419) | Юнакі (n = 1011) | Дзяўчаты (n = 1408) |
|---|---|---|---|
| Жаданне ўмацаваць здароўе | 40,1 | 48,6 | 33,9 |
| Палепшыць фігуру | 41,9 | 41,7 | 42,0 |
| Палепшыць спартыўныя паказчыкі для атрымання лепшай адзнакі за чвэрць, навучальны год | 7,8 | 9,5 | 6,5 |
| Зняць стомленасць пасля навучальных заняткаў | 9,5 | 10,6 | 8,8 |
| Дасягнуць больш высокіх спартыўных вынікаў | 18,2 | 22,5 | 15,1 |
| Рацыянальна выкарыстоўваць свой вольны час | 4,3 | 5,7 | 3,2 |
| Палепшыць фізічнае развіццё | 27,5 | 32,7 | 23,8 |
| Палепшыць настрой, атрымаць задавальненне ад заняткаў | 18,7 | 21,4 | 16,7 |
| Жаданне больш блізкіх зносін з сябрамі, знаёмымі | 7,3 | 6,9 | 7,6 |
| Парады выкладчыкаў | 0,3 | 0,3 | 0,3 |
| Прыклад сяброў, знаёмых | 1,7 | 2,0 | 1,6 |
| Што яшчэ? | 1,4 | 1,9 | 1,0 |

* Пры апытанні рэспандэнты давалі больш як тры адказы.

Значную цікавасць уяўляюць жаданні рэспандэнтаў, накіраваныя на паляпшэнне арганізацыі фізкультурна-аздараўленчай работы па месцы жыхарства. Атрыманыя вынікі сведчаць, што большасць юнакоў (25,6 %) выказалі жаданне займацца ў групе плавання, 24,1 % — у секцыі па відах спорту, 19,1 % — у групе рытмічнай гімнастыкі, 13,7 % — у групе атлетычнай гімнастыкі. Размеркаванне інтарэсаў дзяўчат да відаў заняткаў у фізкультурна-аздараўленчых групах наступнае: 31,2 % выказалі жаданне займацца ў групе рытмічнай гімнастыкі (аэробікі), 30,5 % — у групе плавання, 19,1 % — у спартыўнай групе, 16,3 % — у групе тэніса ці бадмінтона (гл. табл. 6).

Таблица 6

**Структура фізкультурна-аздараўленчых інтарэсаў школьнікаў па месцы жыхарства (% ад ліку апытаных)***

| Віды фізкультурна-аздараўленчых груп | Усяго (n = 2419) | Юнакі (n = 1011) | Дзяўчаты (n = 1408) |
|---|---|---|---|
| Агульнафізічнай падрыхтоўкі | 9,7 | 11,7 | 8,3 |
| Аздараўленчага бегу | 6,1 | 5,5 | 6,5 |
| Рытмічнай гімнастыкі | 26,1 | 19,1 | 31,2 |
| Плавання | 28,4 | 25,6 | 30,5 |
| Атлетычнай гімнастыкі | 11,4 | 13,7 | 9,7 |
| Настольнага тэніса | 9,2 | 10,3 | 8,5 |
| Тэніса ці бадмінтона | 14,8 | 12,8 | 16,3 |
| Лячэбнай фізічнай культуры | 3,4 | 2,6 | 4,0 |
| Спартыўнай секцыі | 21,2 | 24,1 | 19,1 |
| Якія яшчэ? | 10,1 | 13,0 | 8,0 |

*** Пры апытанні рэспандэнты давалі больш як два адказы.**

Даследаваннем устаноўлена, што школьнікі аддаюць перавагу заняткам фізічнай культурай і спортам з хлопцамі і дзяўчатамі прыкладна аднаго ўзросту (58,1 %); 31,8 % жадаюць займацца з таварышамі па вучобе; 12,5 % усё роўна, з кім займацца (гл. табл. 7).

**Таблица 7**

**Пажаданыя інтарэсы школьнікаў у час заняткаў фізічнай культурай і спортам (% ад ліку апытаных)**

| Састаў груп | Усяго (n = 2419) | Юнакі (n = 1011) | Дзяўчаты (n = 1408) |
|---|---|---|---|
| З членамі сям'і | 2,8 | 1,9 | 3,6 |
| З таварышамі па вучобе | 31,8 | 37,8 | 27,5 |
| З равеснікамі | 58,1 | 53,7 | 61,2 |
| З суседзямі | 1,4 | 2,1 | 0,9 |
| Самастойна, індывідуальна | 8,7 | 8,9 | 8,6 |
| Усё роўна, з кім | 12,5 | 13,6 | 11,7 |

Зніжэнне актыўнасці старшакласнікаў, як было выяўлена ў ходзе даследавання, залежыць ад шэрага фактараў. Устаноўлена, што першарадным фактарам як у юнакоў, так і ў дзяўчат з'яўляецца адсутнасць вольнага часу — 17,4 % і 26,9 % ад ліку апытаных адпаведна; другі фактар — адсутнасць умоў для заняткаў (спортзалы, спортпакоя, спортінвентару, спортпляцоўкі), на што ўказалі 11,7 % юнакоў і 14,6 % дзяўчат; трэці фактар — адсутнасць грашовых сродкаў, паколькі многія секцыі арганізаваны ў выглядзе платных паслуг і бацькі не могуць аплаціць заняткі (так адказалі 6,1 % і 9,3 % адпаведна) (гл. табл. 8).

Таблица 8

**Фактары, якія зніжаюць актыўнасць школьнікаў у фізкультурна-аздараўленчай дзейнасці (% ад ліку апытаных)***

| Фактары | Усяго (n = 2419) | Юнакі (n = 1011) | Дзяўчаты (n = 1408) |
|---|---|---|---|
| Няма жадання, інтарэсу | 5,7 | 3,7 | 7,0 |
| Няма вольнага часу | 22,9 | 17,4 | 26,9 |
| Няма ўмоў для заняткаў (адсутнасць спортзалы, спортпакоя, спортінвентару, спортпляцоўкі) | 13,4 | 11,7 | 14,6 |
| Няма грашовых сродкаў | 8,0 | 6,1 | 9,3 |
| Адсутнасць секцый па відах спорту | 6,1 | 5,8 | 6,3 |
| Адсутнасць груп аздараўленчай накіраванасці | 1,9 | 0,9 | 2,7 |
| Вялікая нагрузка на навучальных занятках па фізічнай культуры | 2,3 | 1,7 | 2,8 |
| Не магу арганізаваць свой вольны час | 6,5 | 5,3 | 7,3 |
| Што яшчэ? | 1,2 | 1,2 | 1,1 |

*** Пры апытанні рэспандэнты давалі больш аднаго адказу.**

Трэба адзначыць, што пры наяўнасці вольнага часу 6,5 % апытаных не могуць арганізаваць яго самастойна, у той час як 22,9 % рэспандэнтаў указвалі на недахоп вольнага часу як на адну з асноўных прычын.

У тыднёвым бюджэце школьніка вольны час па навуковых даных складае 10—14 гадзін [1, 2, 3,], у сувязі з гэтым недахоп часу не можа з'яўляцца аб'ектыўнай прычынай няўдзелу старшакласнікаў у занятках фізічнай культурай.

З мэтай выяўлення ў школьнікаў магчымасці плаціць за заняткі фізічнай культурай па месцы жыхарства ў анкеце было пастаўлена пытанне: «Калі заняткі фізічнай культурай па месцы жыхарства будуць арганізаваны ў выглядзе платных паслуг (за памяркоўную плату), ці змогуць бацькі, па вашаму меркаванню, штомесячна плаціць за іх?» (гл. табл. 9).

**Таблица 9**

**Адносіны школьнікаў да заняткаў фізічнай культурай па месцы жыхарства ў выглядзе платных паслуг (% ад ліку апытаных)**

| Віды адказаў | Усяго (n = 2419) | Юнакі (n = 1011) | Дзяўчаты (n = 1408) |
|---|---|---|---|
| Так, змогуць, матэрыяльнае становішча ў сям'і вельмі добрае | 5,8 | 7,9 | 4,3 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Так, змогуць, матэрыяльнае становішча у сям'і добрае | 40,5 | 49,4 | 34,2 |
| Цяжка адказаць, бо матэрыяльнае становішча у сям'і здавальняючае | 26,3 | 23,5 | 28,3 |
| Цяжка адказаць, бо сямейнага бюджэту хапае толькі на прадукты харчавання і самыя неабходныя рэчы | 13,6 | 8,7 | 17,2 |
| Не змогуць, бо сямейнага бюджэту хапае толькі на прадукты харчавання | 4,5 | 3,9 | 4,8 |
| Не ведаю дакладна, як бацькі аднясуцца да маіх заняткаў фізічнай культурай у вольны ад вучобы час | 9,3 | 6,6 | 11,2 |

Даследаваннем устаноўлена, што з агульнага ліку апытаных 40,5 % лічаць, што іх матэрыяльнае становішча ў сям'і добрае і бацькі змогуць аплаціць заняткі фізічнай культурай; 13,6 % рэспандэнтаў не могуць адказаць, таму што сямейнага бюджэту хапае толькі на прадукты харчавання; 9,3 % не ведаюць дакладна, як бацькі аднясуцца да іх заняткаў фізічнай культурай, і толькі 4,5 % адказалі, што не змогуць. Даныя даследавання пацвярджаюць, што можна арганізоўваць платныя паслугі па месцы жыхарства школьнікаў.

Вынікі даследавання паказалі, што ступень рэальнага далучэння школьнікаў да актыўных фізкультурна-аздараўленчых заняткаў па месцы жыхарства яшчэ застаецца дастаткова нізкай. Гэта характэрна ў першую чаргу для асоб маладога ўзросту. Пры гэтым недастатковая актыўнасць вучняў у занятках фізічнай культурай, з аднаго боку, назіраецца на фоне пагаршэння аб'ектыўных сацыяльна-эканамічных і бытавых умоў у Рэспубліцы Беларусь, а з другога — суправаджаецца даволі высокім узроўнем вербальнага інтарэсу да заняткаў фізічнай культурай як сацыяльнай каштоўнасці. Гэта ў многім тлумачыцца нераспрацаванасцю пытанняў фарміравання і развіцця патрэбнасцей школьнікаў у фізічным удасканальванні, якія дэтэрмінуюць іх фізкультурна-аздараўленчую актыўнасць.

**Літаратура**


1. **Соколов В. А.** Источники физкультурно-спортивной активности молодежи. Мн.: Полымя, 1987.
2. **Филиппов Н. Н.** Социологические аспекты формирования двигательной активности у школьников Республики Беларусь // Экономические основы двигательной активности: Матер. Межд. науч. конф. Рязань, 19—21 мая 1999 г. Рязань, 1999.
3. **Филиппов Н. Н.** Особенности формирования потребностей у школьников Республики Беларусь к занятиям физической культурой в новых социально-экономических условиях // Человек, здоровье, физическая культура на пороге XXI столетия: Матер. Межд. науч.-метод. конф. Брест, 30—31 марта 1999 г. Брест, 1999.